*УДК 392:273.2(476.5)*
*ORCID: 0000-0002-6433-0039*
*DOI: 10.47612/2411-2763-2022-9-79-104*

*УЛАДЗІМІР АЎСЕЙЧЫК*

# ВОБРАЗ СТАРАВЕРАЎ У ФАЛЬКЛОРНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ XIX – ПАЧАТКУ XXI ст.)

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт*

***Ключавыя словы:*** этнічныя вобразы, стараверы, беларусы, Беларускае Падзвінне, міжэтнічае ўзаемадзеянне.

**Аннотация.** Один из важнейших ареалов компактного расселения русских старообрядцев на белорусских землях расположен в северной части страны (в Белорусском Подвинье). Процесс переселения староверов в этот регион начался еще в середине XVII в. В статье на основе фольклорных и этнографических источников рассмотрен образ старообрядцев в народной культуре белорусов Подвинья в XIX – начале XXI в. Источниками исследования стали фольклорные и этнографические материалы, зафиксированные в регионе в течение этого периода. Значительную часть материалов составили собственные записи автора, собранные на протяжении 2005–2021 гг. Приходим к выводу, что существенную роль в формировании образа старообрядческого населения сыграл конфессиональный фактор. В идентичности старообрядцев религия занимала исключительное место. Также изолированный и замкнутый образ жизни старообрядцев существенно влиял на количество и характер контактов с местным белорусским населением. Для белорусов региона важное значение при характеристике «чужаков» имели и их хозяйственная деятельность, особенности языка, быта и обрядности. В глазах белорусского населения староверы выступали как хорошие земледельцы, ремесленники и торговцы. В качестве положительных черт их бытовой культуры отмечался запрет на курение табака, регламентация в употреблении алкоголя, обязательное выполнение данного слова и строгое выполнение постов. Но вместе с тем некоторым категориям старообрядческого населения приписывались и чародейские способности, критиковался упрощенный характер заключения брака и игнорирование имущественных прав коренного населения. При этом необходимо отметить, что многие представления как по отношению к староверам, так и с их стороны к местному белорусскому населению, приписывались и представителям других «чужих» (этнических, конфессиональных, профессиональных) сообществ и во многом были обусловлены особенностями восприятия в условиях традиционного общества. Анализ материалов современных полевых фольклорно-этнографических исследований в регионе свидетельствует о том, что, начиная с середины XX в., во взаимодействии белорусов и русских староверов существенно уменьшается дистанция, а взаимоотношения характеризуются добрососедством.

***Ключевые слова:*** этнические образы, старообрядцы, белорусы, Белорусское Подвинье, межэтническое взаимодействие.

*ULADZIMIR AUSEICHYK*

## THE IMAGE OF OLD BELIEVERS IN THE FOLKLORE TRADITION OF THE BELARUSIANS IN THE DVINA REGION (ACCORDING TO THE MATERIALS OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY)

*Polotsk State University*

One of the most important places of compact settlement of Russian Old Believers in the Belarusian lands is located in the northern part of the country (in the Belarusian Dvina region). The process of Old Believers' resettlement to this region began in the middle of the XVII century. In the article, on the basis of folklore and ethnographic sources, the image of Old Believers in the popular culture of the Belarusians of Padzvinnie in the XIX – early XXI centuries is considered. The significant part of the materials consisted of the author's own writings, compiled during 2005–2021. One can conclude that confessional factor played an essential role in shaping the image of Old Believers. Religion played an exceptional role in the identity of Old Believers. Also, the isolated and closed lifestyle of Old Believers significantly influenced the number and character of contacts with the local Belarusian population. For the Belarusians in this region, their economic activities, language, way of life and rituals were also important in characterizing the "outsiders". In the eyes of the Belarusan population, Old Believers were good farmers, artisans and merchants. The prohibition of smoking tobacco, alcoholism, strict observance of the given word and fasting are positive features of their household culture. But at the same time, some categories of the Old Believers' population were ascribed magical powers, criticized simplified marriages and ignored the property rights of the indigenous population. At the same time, it should be noted that many perceptions in relation to the Old Believers as well as to the local Belarusian population, were ascribed to the representatives of other "alien" (ethnic, confessional, professional) communities and in many respects were caused by the features of perception in the conditions of the traditional society. The analysis of the materials of the modern field folklore-ethnographical researches in the region testifies to the fact that starting from the middle of the XX century the distance in the interaction between the Belarusians and Russian Old Believers has significantly decreased, and the mutual relations are characterized by good-neighbourliness.

***Keywords***: ethnic images, Old Believers, Belarusians, Belarusian Padzvinne (Dvina Region), interethnic interaction.

Гісторыя стараверства пачалася ў сярэдзіне XVII ст. У выніку рэформы патрыярха Нікана адбыўся раскол у Рускай праваслаўнай царкве. Сама рэформа прадугледжвала змены ў літургічных кнігах і некаторых абрадах з мэтай іх уніфікацыі з грэчаскімі. Значная частка вернікаў не прыняла новаўвядзенні і захавала старыя абрады (адсюль і назва ў рускай мове – «старообрядцы»), за што зведала ганенні і рэпрэсіі з боку ўладаў. Уцякаючы ад пераследу, многія з іх перасяляюцца ў цяжкадаступныя месцы і аддаленыя тэрыторыі, нават за межы Расіі. Вялікая колькасць рускіх старавераў пасяляецца на землях сучаснай Беларусі, якія ў той перыяд уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага. На паўночнабеларускія землі старавеpы пачалі перасяляцца яшчэ ў другой палове XVII ст. Асноўную іх масу склалі стараверы беспапоўскага сагласу[1].

[1] Беспапоўства – адна з дзвюх асноўных плыняў (разам з папоўствам) у стараверстве, прадстаўнікі якой не маюць царкоўнай іерархіі і духавенства (адсюль і назва). З хрысціянскіх таемстваў у іх прызнаваліся толькі хрост і споведзь, якія, як і богаслужэнне, здзяйсняліся выбраным «настаўнікам». Беспапоўцы падзелены на розныя сагласы. На беларускіх землях у разгляданы перыяд найбольш распаўсюджанымі былі наступныя сагласы: федасееўцы, паморцы, філіпаўцы.

З гэтага часу падзвінскі рэгіён стаў адным з важнейшых месцаў кампактнага рассялення стараверaў-беспапоўцаў на беларускіх землях.

Стараверы, якія пражываюць на беларускіх землях, з'яўляюцца спецыфічнай этнаканфесійнай групай. Яны маюць не толькі выразныя канфесійныя адрозненні, але і этнічныя (як прадстаўнікі рускага этнасу). За больш чым трохсотгадовы перыяд пражывання ў Беларусі перасяленцы-стараверы не толькі развілі сваю культуру, чым узбагацілі культурную спадчыну краіны, але таксама аказалі ўплыў на мясцовае беларускае насельніцтва. Разам з тым працяглае міжэтнічнае ўзаемадзеянне не прайшло для кантактавальных бакоў бясследна. Яго вынікі праявіліся ў фарміраванні вобраза чужой этнічнай супольнасці. Этнічныя вобразы з'яўляюцца неад'емным кампанентам суцэльнай карціны свету, даследаванне якіх дазваляе больш глыбока характарызаваць усю спецыфіку этнакультурнага ўзаемадзеяння. Гэта ў поўнай меры датычыцца і ўзаемадзеяння беларусаў і рускіх стараверaў на Падзвінні.

*Мэта* дадзенага артыкула – разгледзець этнічны вобраз стараверaў у фальклорнай традыцыі беларусаў Падзвіння XIX – пачатку XXI ст. *Крыніцамі* даследавання сталі фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы, зафіксаваныя ў рэгіёне на працягу адзначанага перыяду. Значную частку матэрыялаў склалі ўласныя запісы аўтара, сабраныя ў ходзе палявых фальклорна-этнаграфічных даследаванняў на Падзвінні ў 2005–2021 гг.

## З гісторыі даследавання

У беларускай гуманітарыстыцы этнічнаму вобразу стараверaў не прысвечана вялікая колькасць публікацый. Але ў той жа час асобныя аспекты дадзенай праблематыкі былі разгледжаны ў шэрагу прац. Першыя выданні, дзе закранаецца гэтая тэма, былі апублікаваны яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Аднак яны змяшчалі толькі матэрыялы, якія характарызавалі спецыфіку ўзаемаадносінаў беларускага насельніцтва са стараверамі, а таксама некаторыя заўвагі аўтараў на гэты конт. Уласна навуковае асэнсаванне матэрыялаў пачалося толькі ў пачатку XXI ст. У гэты перыяд былі апублікаваны даследаванні У. А. Лобача («Восточный сосед. Образ русского в белорусской традиционной культуре» [Борисёнок, Лобач 2002], «Вобраз "асташа" (старавера) у творах Яна Баршчэўскага» [Лобач 2003]), у якіх раскрываюцца некаторыя аспекты вобраза стараверaў у народнай культуры беларусаў. Асаблівую ўвагу даследчык звяртае на ўяўленні беларусаў Падзвіння адносна «асташоў» (рускіх стараверaў з Асташкаўскага павета Цвярской губерні). На аснове матэрыялаў палявых даследаванняў канца XX – пачатку XXI ст. у калектыўным артыкуле М. П. Антропава, А. М. Боганевай, Т. В. Валодзінай былі разгледжаны канфесійныя стэрэатыпы адносна стараверaў у беларускім вясковым грамадстве [Антропаў 2007, 155–166]. Дадзеная праблематыка знайшла адлюстраванне і ў публікацыях беларускіх этнолагаў У. Іванова [Іваноў 2006; Іваноў 2008; Іваноў 2010], С. А. Захаркевіча і Ю. І. Внуковіча [Захаркевіч 2016]. Шэраг артыкулаў па гэтай тэме быў апублікаваны аўтарам дадзенай працы [Аўсейчык 2007; Аўсейчык 2008; Аўсейчык 2018; Аўсейчык 2019; Овсейчик 2019].

## Этнонімы і найменні

На характар і спецыфіку міжэтнічнай камунікацыі значным чынам паўплывала імкненне старавераў да адасобленага ладу жыцця, каб захаваць у «чысціні» сваю веру. Адасобленасць, замкнёнасць і нежаданне мець зносіны з іншаверцамі былі выпрацаваны ў выніку доўгачасовых праследаў уладаў і царквы. Таму старaверы імкнуліся па магчымасці менш судакранацца з «антыхрыставым светам» і «апаганенай антыхрыстам царквой» [Русские 2005, 707]. Гэтая акалічнасць стала прычынай таго, што на тэрыторыі Падзвіння, як і ў многіх іншых месцах, старавeры жылі ізалявана, замкнёнымі абшчынамі і даволі часта ўтваралі асобныя пасяленні. Яны сяліліся пераважна ў цяжкадаступных месцах, як, напрыклад, старaверы в. Дрысвяты Браслаўскага р-на, якія да пачатку XX ст. жылі на востраве. Такая сітуацыя ў некаторых месцах Падзвіння захавалася і да цяперашняга часу. Нават у ходзе сучасных палявых даследаванняў дабрацца да некаторых стараверскіх пасяленняў у рэгіёне не так проста. На тэрыторыі Беларускага Падзвіння існавалі і змешаныя пасяленні. Як пазначаў М. Без-Карніловіч: «У губернях: Віцебскай і Магілёўскай раскольнікі спачатку жылі асобнымі слабодамі, прытрымліваючыся сваіх звычаяў; час і любоў зрадніл і некаторых нашчадкаў даўніх выхадцаў з прыроднымі беларусамі» [Без-Корнилович 1855, 240]. Але нават калі стараверы і пражывалі ў адным населеным пункце з іншаверцамі, то ўсё адно стараліся трымацца адасоблена, што адзначалі даследчыкі другой паловы XIX ст.: «Віцебскія велікарусы жывуць часткова асобнымі ад іншых народнасцей пасяленнямі... часткова разам з імі: але ў тым і другім выпадку раскольнікі трымаюцца асобна» [Сементовский 1872, 20]. Гэтая «адасобленасць» прыхільнікаў старых абрадаў праяўлялася ў тым, што вёска часам падзялялася на дзве часткі. Беларускі гісторык-эмігрант Ю. Віцьбіч прыводзіў такі прыклад: «Насельніцтва гэтае вёскі [в. Застарынне Бешанковіцкага р-на. – *У. А.*] напалову складалася з тубыльцаўбеларусаў, а напалову з маскалёў, як называе наш народ расейцаў-стараверaў, што яшчэ ў XVIII ст. эміґравалі ў вольную Літву ад рэлігійных перасьледаў. Яны захавалі тут сваё веравызнаньне, мову і звычаі, выразна адрозніваючыся ад другой паловы вёскі. Таму і вёска падзялялася на два канцы – Літоўскі і Маскоўскі» [Віцьбіч 2007, 246–247]. Жывучы адасоблена, стараверы ў асноўным падтрымлівалі сувязі толькі са сваімі аднавяскоўцамі, нават кантакты з прадстаўнікамі іншых абшчын амаль не наладжваліся. Такая сітуацыя назіралася яшчэ ў сярэдзіне XX ст.: *Мы всегда жылі в своей деревне і даже к москалям в соседнюю деревню ходілі очень редко, у ніх была своя моленная, а ў нас своя*[1]. Такі адасоблены лад стараверaў праявіўся ў тым, што ў мясцовых беларусаў нелюдзімага чалавека маглі называць *старaверам*: *Ай, стараверы гэта вот, ну вот такі чалавек каторы вот, ну як, ня ўходзіць у кампанію ні ў якую, вот адзіляецца, гэта старавер*[2].

[1] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2005 г. ад В. Р. Маськова, 1928 г. н., у в. Кірыліна Браслаўскага р-на.

[2] Зап. экспедыцыяй ПДУ ў 2007 г. ад І. У. Рублеўскай, 1924 г. н., у в. Бабча Лепельскага р-на.



Каменны крыж на могілках
в. Кірыліна Браслаўскага р-на. 2021 г.
Фотаздымак аўтара

Усведамленне прадстаўнікамі этнічнай супольнасці свайго групавога адзінства, якое ў навуцы называецца этнічнай самасвядомасцю, знешне выяўляецца ў саманазве (этноніме). У сваю чаргу існаванне саманазвы прадугледжвае і наяўнасць шэрагу этнонімаў у адносінах да іншых этнасаў ці этнічных груп, бо ўяўленні пра «сваю» групу неадрыўна звязаныя з уяўленнямі пра групы «чужыя». На Беларускім Падзвінні найбольш пашыраным найменнем, якім мясцовае насельніцтва вызначала старавераў, стаў палітонім *маскаль*: *А каго ў вас называлі маскалямі: усіх рускіх ці старaабрадцаў? – Стараўвераў. У іх свая была вера* [ТМКБ 2004, 762]. Як вынікае з крыніц і палявых матэрыялаў, старaверы даволі адмоўна ўспрымалі назву «маскалі». Але паміж сабой яны даволі часта выкарыстоўвалі гэтае найменне. Гэта пацвярджаецца як крыніцамі XIX – пачатку XX ст., так і матэрыяламі сучасных палявых даследаванняў. Калі з боку беларусаў выкарыстанне наймення «маскаль» станавілася для стараверaў абразай, то ў той жа час «...самі між сабою, яны з лёгкасцю і без усялякай крыўды называюць адно аднаго “маскалём”» [Іваноў 2006, 31]. Словы ж «старaверы» ці «старaабраднікі» сярод беларускіх сялян для вызначэння прыхільнікаў старых абрадаў выкарыстоўваліся даволі рэдка. Нават у ходзе сучасных палявых даследаванняў нярэдка ўзнікалі сітуацыі, калі беларусы-рэспандэнты не разумелі, хто такія «старaверы» ці «старaабрадцы», у той жа час добра ведалі пра сваіх суседзяў-«маскалёў». У той жа час выпадкаў выкарыстання слова «раскольнік» з боку мясцовага беларускага насельніцтва не зафіксавана ні ў крыніцах XIX – пачатку XX ст., ні ў матэрыялах палявых даследаванняў.

Акрамя гэтых назваў, мясцовае беларускае насельніцтва мела некаторыя найменні стараверaў, якія датычыліся спецыфікі іх заняткаў ці нейкіх культурных адметнасцей. Як вынікае з крыніц, называлі стараверaў і «бурлакамі»: «...акрамя пошукаў адасобленага жыцця і вольнай раллі, рускія людзі з “непомных”, як гавораць старaверы, часоў хадзілі на Літву – дзеля заробкаў, пераважна па раздзелцы і сплаве па Нёмане лесу, адгэтуль мясцовае найменне іх бурлакамі, якое захавалася да нашых дзён [на пачатак XX ст. – *У. А.*] і ўжываецца да ўсіх стараверaў і наогул выхадцаў з карэннай Расіі» [Станкевич 1909, 8]. Падобная назва стараверaў яшчэ фіксавалася ў ходзе палявых даследаванняў

у сярэдзіне XX ст. (хут. Мураўёўка Ашмянскага р-на) [АІМЭФ, арк. 6]. Сярод беларусаў Браслаўшчыны зафіксавана яшчэ адна мянушка старавераў – «маканікі». Яна тлумачыцца традыцыяй хрышчэння ў стараавераў з поўным трохразовым акунаннем у купель з вадой, якая адрозніваецца ад праваслаўнай і каталіцкай.

> Маскалі. Ну яны тожа, у іх эта ўжо, вот праваславіе – эта ўжо пахожая, як і каталічаская, тая самая, вот будзе храсціць у праваслаўным, ужо каталікі не будут храсціць, або, а гэта ужо маканнік выходзіць. <...> Ну ён ж яшчэ, ну у бочку садзяць гэта, хрысцяць. Не то шта вадзічкай там палівають па галоўке, ну як жа закрывають ушы і глаза, ну і <...>. І макають. Вот, эта старая вера, гэта ну іх саўсем славянская там такая пачытаць, тока такія якія старыя гэта могуць[1].

У сваю чаргу ў якасці адказу на такую мянушку мясцовыя стараверы называлі беларусаў-католікаў «лабунамі» (бо хрышчэнне ў каталіцкім касцёле адбываецца з памазваннем ілба).

Стараверы Падзвіння таксама мелі некалькі найменняў у адносінах да мясцовага беларускага насельніцтва. Стараверы Шумілiншчыны называлі нестараверaў *злябамі*: *Злябы месных называлі, ня любілі нас*[2]. Часам яны выкарыстоўвалі словы *паганікі* (па прычыне рэлігійнай адрознасці: «Паганікі – прадаліся»[3]), *сіпакі* (зневажальнае слова, якім стараверы называлі праваслаўных [Отчет 1889, 203]) і г. д. Як вынікае з аналізу матэрыялаў, большая частка гэтых



Інтэр'ер стараверскай малельні ў аг. Друя Браслаўскага р-на. 2021 г. Фотаздымак аўтара

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2021 г. ад С. Ф. Рыхцер, 1933 г. н., у в. Чэрнева Браслаўскага р-на.

[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад К. Ф. Асіповай, 1928 г. н., у в. Маркава Шумілінскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад Н. П. Карнілавай, 1929 г. н., у в. Непароты Шумілінскага р-на.

найменняў з'явіліся па прычыне рэлігійнай адрознасці. Стараверы называлі «паганікамі», «нячыстымі» і інш., бо лічылі толькі сваю веру адзіна «правільнай».

Ва ўмовах традыцыйнага грамадства характарыстыка і намінацыя маловядомых ці незнаёмых аб'ектаў часам адбывалася праз ужо добра вядомыя катэгорыі. Па гэтай прычыне некаторыя прадстаўнікі іншых этнасаў маглі называцца «чужымі» этнонімамі (асабліва ў выпадку некаторага падабенства ў занятках, антрапалагічных рысах). Так, напрыклад, цыганоў у Швецыі амаль да XVII ст. называлі «татарамі» [Фрэйзэр 2003, 101]. Падобная сітуацыя назіралася і ў вызначэнні беларускім насельніцтвам стараввераў і наадварот. Як пазначаў М. Я. Нікіфароўскі, «па непарушнай упэўненасці мясцовага просталюдзіна "маскаль ёсць белы жыд"; па такім жа перакананні маскаля, "мужык ёсць палячок бязмозглы"» [Никифоровский 1893, 135–136]. Такія «параўнанні» сведчаць пра атаясамленне ў вачах беларусаў стараввераў з яўрэямі (відаць, па прычыне агульнасці заняткаў у гандлёвай сферы), а ў вачах прыхільнікаў старых абрадаў – беларусаў з палякамі (верагодна, з-за значнага ўплыву каталіцкага касцёла і моўных асаблівасцей).

## Гаспадарчая характарыстыка стараввераў

У беларускай народнай культуры пры характарыстыцы стараввераў даволі часта ўзгадваецца, што яны з'яўляюцца прышлым («чужым») насельніцтвам: «Яны [стараверы. – *У. А.*] прыйшлі з другой зямлі, і вера ў іх другая, не пахожая на нашую»[1]. Прычынай з'яўлення стараввераў на Падзвінні мясцовае беларускае насельніцтва часам называе рэлігійныя ганенні і праследы прыхільнікаў старога абраду на тэрыторыі Расійскай дзяржавы.

> Кагда Пётр, жылі, не прынялі эту рускую веру і сюды ўцяклі[2].
>
> Яны болі рускія. Да, яны болі рускія, яны прыйшлі адтуль, адтуль з Маскоўшчыны і тут пасяліліся. <...> Ну там жа неяк было пры нейкім цару на іх ганеніе было. Там жа яны усё тады ўпярод, скіты гэта у іх называліся. Там яны прапаведавалі сваю веру[3].

Часам у якасці прычыны перасялення рэспандэнты-беларусы называюць іх нежаданне галіць бараду:

> Не, а вы, а по історіі вы не знаете, как прі Петре у центре Россіі жылі, ані не паслухалі. Петр первый был же прыказаўшы і баярам всем сбріть бороды, вот і чтоб все сбрілі бороды, оні не паслухалі, і яны былі переселены на окраіны Россіі. Вот, ну і с тех пор яны тута і... ад пакалення да пакалення так і жывуць[4].

[1] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2001 г. ад Т. А. Сухоўскай, 1915 г. н., у в. Кляўсы Браслаўскага р-на.
[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад І. А. Еськова, 1938 г. н., у в. Жарцы Полацкага р-на.
[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2008 г. ад Л. Ф. Марковіч, 1925 г. н., у в. Пераброддзе Мёрскага р-на.
[4] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2008 г. ад І. А. Шкляровай у в. Ніўнікі Мёрскага р-на.

Разам з тым пазначаецца і той факт, што сяліліся стараверы пераважна на новых землях у цяжкадаступных месцах, высякаючы лясы і расчышчаючы тэрыторыю для свайго паселішча і тым самым не выцясняючы мясцовае насельніцтва: *Ну як свякрова расказывала: тут пасяліўся первы маскаль. Трі браты было: на малым узгор'е, на бальшым і тут. Тут раней лясы былі і мядзведзі дажа. Эта ж цяпер нет нічога* [ТМКБ 2004, 762]. У гэтым плане стараверы выступаюць у якасці своеасаблівых культурных герояў, якія асвойваюць прастору і таму характарызуюцца даволі пазітыўна. На падобную характарыстыку латышоў з боку беларусаў Падзвіння звяртаў увагу У. А. Лобач [Лобач 2009, 54]. У ходзе сучасных палявых даследаванняў фіксуецца і адваротная асаблівасць. Рэспандэнты-беларусы старавераў часта не разглядаюць як прышлае насельніцтва, а, наадварот, указваюць на іх «даўняшні» характар пражывання на гэтых землях.

Пры фарміраванні вобраза іншай этнічнай супольнасці вельмі важнай з'яўляецца яе гаспадарчая характарыстыка. Адным з прыярытэтных для мясцовага беларускага насельніцтва Падзвіння з'яўляўся менавіта гаспадарчы вобраз старавераў, які меў даволі пазітыўны характар. Рускія перасяленцы вызначаліся грунтоўнасцю вядзення гаспадаркі і яе заможнасцю, за што заслужылі павагу з боку мясцовага беларускага насельніцтва. Акрамя працы на зямлі, стараверы займаліся і іншымі відамі гаспадарчай дзейнасці, дзе таксама праявілі сябе як добрыя работнікі. Такая агульная характарыстыка старавераў даволі распаўсюджаная ў крыніцах XIX – пачатку XX ст.:

> Сярод старавераў, якія жывуць у сёлах і вёсках, пераважная большасць занята земляробствам, але наогул яны не маюць нязменнай схільнасці да земляробства, ахвотна змяняючы яго на іншыя промыслы. З ліку старавераў выходзяць вельмі добрыя гандляры, часам вельмі багатыя, і рамеснікі; многія займаюцца падрадамі; сярод тых, што жывуць у гарадах большасць займаецца садаводствам і агародніцтвам. Ведучы цвярозы лад жыцця, адрозніваючыся прыроднай кемнасцю, фізічнай крэпасцю, маючы апору ў выпадку матэрыяльнай патрэбы ў сваіх адзінаверцаў старавер з'ўляецца выдатным работнікам, гандляром і падрадчыкам, які заслугоўвае агульнага даверу. У Заходнім краі ставяцца да старавераў з вялікай павагай як да дзелавітых людзей, хоць і не заўсёды далюбліваюць [Россия 1905, 206].

Успаміны пра старавераў як добрых гаспадароў і работнікаў даволі пашыраныя сярод рэспандэнтаў і ў ходзе сучасных палявых даследаванняў у рэгіёне. На Падзвінні стараверы вядомыя і як добрыя цесляры: *Плотнік быў маскаль. Хадзіў, такія рамы дзелаў раньша.* <...> *Очэнь харошы чалавек. Выпіць ён любіў, канешне, ну харошы.* <...> *Очэнь дарагі чалавек. І разьба па дзераву, усё, што хочаш*[1]. Сярод мясцовага беларускага люду лічылася, што яны з'ўляюцца спрытнымі паляўнічымі і рыбаловамі: *Жыў тут такі Пятруха-маскалёк, дык ён нікагда без звяра ці птушаніны якой з лесу не прыходзіў, а з возера заўсёды рыбіну валачэць, дык гэта і не ўдзівіцельна, бо ён жа маскаль, а яны да гэтага дужа спрытныя*[2].

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам і У. С. Філіпенкам у 2005 г. ад Т. Д. Маскалёвай, 1935 г. н., у в. Івоніна Шумілінскага р-на.

[2] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2001 г. ад Н. І. Навічонак, 1924 г. н., у в. Кляўсы Браслаўскага р-на.

## Фальклорная антрапалогія

Пры вызначэнні «чужынцаў» значная ўвага надаецца асаблівасцям іх знешняга выгляду (антрапалагічныя рысы, адзенне і г. д.). Адной з самых спецыфічных знешніх рысаў старавераў, на якую заўсёды звярталі ўвагу мясцовыя беларусы, была вялікая барада: *А калі сорак лет, ані* [стараверы. – *У. А.*] *атпускалі во такія бороды, у сорак. Да сарака брыліся. Красівыя, культурныя, а ўжо сорак лет – с такімі мётламі хадзілі*[1]. Забарона на галенне барады ў стараавераў-мужчын сталага ўзросту фіксуецца і ў ходзе сучасных палявых даследаванняў. Рэспандэнты-стараверы тлумачаць існаванне такога звычаю неабходнасцю пахавання мужчыны толькі з барадой: *Некоторые уже ходзілі так брытыя і старыкі. І вот бывала прыдзёт старык к аўталаўке там. Сабіраемся каля аўталаўкі там. Прыходзят срэдзі дзярэўні, а яму гаварат: «Ну чаво ты, як цебя хараніць? Чаво у цебя барады нет?»*[2]. Гэтая адметнасць была даволі прынцыповай, бо беларусы (а асабліва каталікі), за выключэннем насельніцтва Магілёўскай губерні, бароды і вусы галілі [Киркор 1994, 284]. Як пазначаў Е. Р. Раманаў, «...у акаталічанай мясцовасці ксяндзы патрабуюць абавязковага галення барады, “каб ня быць пахожым на кацапа” (Аршанскі павет)» [Романов 1912, 308]. У міфалогіі многіх славянскіх народаў барада даволі ўстойліва суадносіцца з паняццем чарадзейства і з’яўляецца неад’емнай прыкметай чараўніка [Валодзіна 2004, 42–43]. А таму часам асаблівы знешні выгляд стараавераў у вачах беларусаў набліжаў іх да прадстаўнікоў інфернальнай сферы (чорта): *Нейкія яны не такія; а жанчыны ходзяць вымазаныя, непрыгожыя, а мужыкі валасатыя і бароды не стрыгуць, як чэрці*[3].



Сяляне-стараверы Лепельскага павета.
Фотаздымак М. Кусцінскага, 1866 г.
(F46-Vilniaus viešoji biblioteka ir senienų muziejus)

Сярод мясцовага беларускага насельніцтва істотная ўвага была засяроджана на адметнасцях у адзенні. Нягледзячы на тое, што касцюм стараавераў ужо з канца XIX ст. зазнаў істотныя змены, на што звярталі ўвагу даследчыкі, але некаторыя дэталі традыцыйнага строю дажылі і да нашых

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад А. Д. Пятроўскай, 1935 г. н., у в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.
[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2008 г. ад І. А. Шкляровай у в. Ніўнікі Мёрскага р-на.
[3] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2003 г. ад А. К. Войтанец, 1920 г. н., у в. Пагошча Браслаўскага р-на.

дзён (у пахавальным адзенні і некаторых элементах, характэрных для богаслужэння). Пра асаблівасці нават паўсядзённага адзення стараевераў часам згадваюць рэспандэнты: *Бароды бальшыя, ваабражаюць, што яны маскалі. У Плісах там былі... Надзенуць рубахі дління, ходзяць старыкі*[1]. У сучасны перыяд асаблівай увагі з боку мясцовага насельніцтва заслугоўвае спецыфічны строй для набажэнства і, асабліва, чорны «плат» у жанчын-стараверак:

> Жывуць такія, ёсць жа нескалькі тут, я знаю Паліну такую, Смалякову, яна стараверка, яна платкі так завязывае не так, как мы, завяжам на ўзялок, а яны завяжуць вот так, закладаюць... Не вузлом, а закладаюць, пад ніз можа булаўку ілі што яна, такі вот, стараверы гэці[2].

### «Яны па-маскоўску разгуварывалі»

Пры характарыстыцы стараевераў беларусамі Падзвіння адной з іх спецыфічных рысаў пазначаецца валоданне «іншай» – рускай («маскоўскай») – мовай: *Ну, яны па-маскоўску разгуварывалі*[3]. Мова становіцца вельмі важнай этнавызначальнай прыкметай асабліва ў такім выпадку, калі іншыя адрозненні адсутнічаюць ці з цягам часу ўжо сцёрліся і знешне не заўважныя (у нашым выпадку такая сітуацыя найбольш характэрна для другой паловы XX – пачатку XXI ст.). Моўныя адрозненні, на думку беларускага насельніцтва, праяўляюцца, найперш у лексіцы:

> Вот у нас качарга, у печцы памішаць, а ў іх – клюка, а мы завём вілкі такія, што чугункі с печкі браць, а ані гаварат ухват, у нас скварaду браць – чапяла завецца, а ані гаварaць – падскварoднік. Патом, гавару, мне нада хату замкнуць, а ані гаварат – ой, нада ізбу замкнуць. Толька ў рэчы разніца[4].

Акрамя разыходжанняў лексічнага плана, пазначаюцца і адрозненні ў вымаўленні, якія праяўляюцца ў прыёме «цытавання» – уставак на «чужой» мове пры агучванні прамовы прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцей. У такіх устаўках рэспандэнт стараецца, па магчымасці, перадаць рознага характару моўныя асаблівасці этнічных суседзяў, змяняючы нават тон голасу, тым самым яшчэ раз падкрэсліваючы існаванне адрозненняў. Стараверы таксама ўказвалі на моўныя адрозненні з мясцовым насельніцтвам: «Мы рускія, наша реч такая, не саідіняецца с этай, нашы слова ні такіі» [Минина 2001, 149].

На Беларускім Падзвінні стараверам часам прыпісвалі і чарадзейныя здольнасці. Прытым такія ўяўленні найбольш характэрныя ў адносінах тых стараевераў, якія займаліся адрознымі ад сельскай гаспадаркі заняткамі. Першым, хто засведчыў веру беларусаў у чарадзейныя якасці стараевераў (*асташоў* – рускіх

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам і У. С. Філіпенкам у 2005 г. ад А. М. Дзягілевай, 1912 г. н., у в. Пятніцкае Шумілінскага р-на.

[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2021 г. ад І. І. Кунцэвіч, 1937 г. н., у аг. Друя Браслаўскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад В. С. Варкулевіч, 1921 г. н., в. Вайловічы Шумілінскага р-на.

[4] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад А. Д. Пятроўскай, 1935 г. н., в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.



Багаяўленская стараверская царква ў в. Ластавічы Глыбоцкага р-на. 2021 г.
Фотаздымак аўтара

старавераў з Асташкаўскага павета Цвярской губерні), быў Я. Баршчэўскі: «А каб мець большы прыбытак з азёраў, наводзяць [паны. – *У. А.*] штогод зімою асташоў, кажуць, што гэтыя рыбакі нібыта пасылаюць пад лёд злога духа, і той заганяе рыбу ў нерат; дык яны спустошылі ў нас усе азёры, навучылі нашу моладзь бязбожным учынкам, чарам, бессаромным песням» [Баршчэўскі 1998, 146]. Падобным чынам пісаў пра «асташоў» і вядомы этнограф С. В. Максімаў:

> З даўніх часоў усе вялікія рыбныя азёры Віцебскай Беларусі бяруцца ў арэнду і вылоўліваюцца выключна... «асташамі», якіх... мясцовы люд лічыць чараўнікамі і чортавымі братамі. Хочаш выцягнуць сетку поўную ляшчоў, выцягваеш розных пачвараў з вялікімі галовамі, з вогненымі вачыма і скуранымі перапончатымі крыламі. Усяму шкодзіць асташ. Адна легенда гаворыць, што самога чорта бачылі ў вобразе асташа, г. зн. рыбаком у скураным фартуху, з шырокай барадой і з круглым чырвоным тварам [Максимов 1994, 446].

Неабходна адзначыць, што ў прыгаданых выпадках чараўнікамі выступаюць «прышлыя» («чужыя») стараверы, якім ужо толькі па гэтай прычыне і незалежна ад канфесійнай ці этнічнай прыналежнасці могуць прыпісвацца такія якасці. Што ж датычыцца «мясцовых» («сваіх») старавераў, якія ва ўмовах традыцыйнага грамадства хоць і надзяляюцца звышнатуральнымі (магічнымі) здольнасцямі, але характарызуюцца значна лепш і часта вядомыя як добрыя знахары, што дапамагаюць людзям.

> Старавераў у нас лічылі за добрых знахараў, і калі каму што балела ці здаралася няшчасце, то за дапамогай не баяліся прыходзіць і да старавераў, хоць некаторыя і казалі, што яны і шкодзяць[1].

[1] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2003 г. ад А. К. Войтанец, 1920 г. н., у в. Пагошча Браслаўскага р-на.

– А вот яшчэ не гаварылі, ну вот як жэ ж раней урачэй не было, бабушкі былі, што вадзічку давалі? – Да, загаварывалі. У самой такая Васільева была, ну старая, болей стараверы знালі[1].

Асабліва такая сітуацыя фіксуецца на Браслаўшчыне. Наяўнасць тут стараверsucc-знахароў абумоўлена і тым фактам, што сярод каталіцкага насельніцтва рэгіёна знахарства лічылася грахом, на што пастаянна звярталі ўвагу каталіцкія святары. У той жа час сярод мясцовага насельніцтва фіксуюцца ўяўленні пра тое, што стараверы здольныя і «падрабляць»: *Ёсць тут нейкія людзі врэдныя, але я не знаю. Гэта болей стараверы, яны болей ня вераць у Бога. «...» Яны ў Бога ня вераць, каталік гэтага не зробіць, неа*[2]. Прыхільнікі старых абрадаў, у сваю чаргу, прыпісвалі чараўніцкія здольнасці мясцоваму насельніцтву, найперш каталікам: *Варожаць у нас на нядобрае толькі каталікі*[3].

## Побыт старавераў праз прызму фальклорнай традыцыі беларусаў

Значнае месца ў фарміраванні этнічных вобразаў належыць таксама і комплексу ўяўленняў аб сямейным ладзе, звычаях, традыцыях і рысах характару прадстаўнікоў «чужой» этнічнай групы. Адной з пазітыўных рысаў старавераў была забарона ўжываць тытунь, на што звярталі ўвагу этнографы XIX – пачатку XX ст. [Россия 1905, 204]. Такія згадкі аб забароне на паленне тытуню фіксуюцца і ў час палявых даследаванняў: *В хате ікона вісела – курыць не разрешаецца*[4]. Але часам гэтая забарона магла выкарыстоўвацца мясцовым беларускім насельніцтвам для насмешак: *Маскалі верна ўсе ні курылі... Назло тагда мальцы засыпаюць табаку ім за ікону*[5]. Старaверскае насельніцтва Падзвіння вызначалася і рэгламентаваным спажываннем алкаголю. У гэтым сэнсе яны значна лепей характарызаваліся, чым іншыя прадстаўнікі рускага этнасу. Як пазначаў М. Я. Нікіфароўскі, сярод тутэйшых «цяжка прасачыць тыповыя асаблівасці “запойцы”, якія ў поўнай красе назіраюцца ў “маскалькоў”, што даволі раскідана жывуць на Паўднёва-Усходняй ускраіне губерні і гэтым моцна адрозніваюцца ад цвярознікаў-маскалёў Полацкага, Гарадоцкага, Дрысенскага, Рэжыцкага паветаў» [Никифоровский 1896, 82]. Як пазітыўная рыса згадвалася строгае выкананне імі пастоў: *А ўжо пасты пасціла баба, ай-яй. Жырнага нічыго ні ест, кагда празнік і пасты бальшыя*[6]. Беларусамі таксама паважалася абавязковае выкананне старaверамі дадзенага слова, якое «...у гандлёвых справах ішло за вэксаль» [Максимов 1994, 457]. Пра гэта згадваюць і рэспандэнты:

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2021 г. ад С. Ф. Рыхцер, 1933 г. н., у в. Чэрнева Браслаўскага р-на.

[2] Зап. У. С. Філіпенкам у 2008 г. ад А. В. Ярмаловіч, 1933 г. н., у в. Старае Сяло Шаркаўшчынскага р-на.

[3] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2005 г. ад В. Р. Маськова, 1928 г. н. у в. Кірыліна Браслаўскага р-на.

[4] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад Н. А. Танана, 1932 г. н., у в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.

[5] Зап. У. Я. Аўсейчыкам і У. С. Філіпенкам у 2005 г. ад Т. Д. Маскалёвай, 1935 г. н., у в. Івоніна Шумілінскага р-на.

[6] Зап. У. Я. Аўсейчыкам і У. С. Філіпенкам у 2005 г. ад Т. Д. Маскалёвай, 1935 г. н., в. Івоніна Шумілінскага р-на.

*Ну а кагда дзеньгі аддалжаў ён* [старавер. – *У. А.*], *вот, іменна, скажыць: «Аддам табе чэраз нядзелю». І ён у другога аддалжыць дзеньгі, а мне прынясець і аддасць*[1]. Даволі паказальнымі ў характарыстыцы маральнага ўзроўню прышлага насельніцтва з'яўляюцца словы Архіепіскапа Полацкага і Віцебскага (афіцыйнай праваслаўнай царквы!) Васілія адносна полацкіх старавераў-беспапоўцаў: «Усе яны трымаюцца сваёй веры вельмі настойліва, асабліва ў в. Жарцы. Гэтыя раскольнікі даволі заможныя, у вышэйшай ступені адважныя, сваім уплывам падтрымліваюць раскол, даючы ўсім прытулак» [Гарбацкі 1999, 173].

У той жа час што датычыцца заключэння шлюбу ў старавераў, то яно, у адрозненне ад складанага і развітага ў беларусаў вясельнага абраду, адбывалася на працягу аднаго вечара. А ў беспапоўцаў адсутнічала яшчэ і вянчанне. Гэта спарадзіла меркаванне аб распусце старавераў: «Раскольнікі не прызнаюць святасць шлюбу, мала даражаць шлюбнымі сувязямі, жанчыны не надаюць вялікага значэння цнатлівасці і шлюбнай вернасці» [Сементовский 1872, 20]. Пра гэтую «асаблівасць» стараверaў узгадваў і М. Я. Нікіфароўскі, які пазначаў, што «дзякуючы падкасці "маскалькоў" і легкадумнаму погляду на стасункі мужчын і жанчын, рэдкая пасобніца выходзіць са службы не пакрыўджанаю дарэшты» [Никифоровский 1893, 137]. Асаблівы каментар у мясцовага беларускага насельніцтва знайшоў звычай «выкрадання нявесты», які, паводле слоў рэспандэнтаў (як рускіх стараверaў, так і беларусаў), існаваў яшчэ ў першай палове XX ст.:

> Ну гэта прынята было ў маскалей там вот так вот украсцеся [нявесту. – *У. А.*]. У нас не, наадварот, сцыталася гэта пазорам[2].
>
> Кралі яны гэтыа самая... фэст, такі быў, і яны паедуць сабіраюцца ўсе ж там гэтыя маскалі, і тады панравіцца дзеўка – украдуць, на воз на коней давней ездзілі... не было машын, ну украдуць прывязуць – і ўсё, астаецца яна[3].

Існаванне такога спецыфічнага звычаю фіксуецца і ў больш ранніх крыніцах [Посох 1895; Філіпенка 2003].

Як адну з негатыўных рысаў беларусы Падзвіння вылучалі ігнараванне старaверамі ўласніцкіх правоў карэннага насельніцтва. Сярод іх не лічылася за грэх украсці што-небудзь у «іншаверцаў»-беларусаў, у той час як аналагічны ўчынак у адносінах да адзінаверца разглядаўся імі як цяжкае злачынства. Гэта акалічнасць стала прычынай бытавання сярод беларусаў пераканання пра схільнасць стараверaў да крадзяжоў і іншых відаў злачынстваў: *Раньшэ ж тожа вары былі: авечак кралі, кароў кралі, каней кралі... Маскалі. Асабліва маскалі. Гаворюць: трі паклоны атбіў – і ні грэху нет* [ТМКБ 2004, 782]. Беларускія сяляне Лепельшчыны, жартуючы, нават казалі, што *ў раскольнікаў у папы*

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад Е. М. Балашэўскай, 1928 г. н., у в. Саладухі Шумілінскага р-на.

[2] Зап. В. Лях, А. Нешчарэтам у 2008 г. ад В. І. Хоміч, 1937 г. н., у в. Мікіцёнкі Шаркаўшчынскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад Л. І. Шыдлоўскай, 1924 г. н., у в. Глішчына Пастаўскага р-на.



Абразы ў хаце стараверскага настаўніка Цімафея Арцем’евіча Балтунова, 1939 г. н., в. Кірыліна Браслаўскага р-на. 2021 г. Фотаздымак аўтара

*выбіраюць тых, хто найбольш высядзеў у астрозе* [Горбачевский 1895, 24]. Даволі часта крадзеж з боку старавераў успрымаўся вельмі іранічна: *Быў тут у нас старавер. Добры быў мужык, любіў украсць што-нібудзь. Вот, пойдзець агурцоў накрадзіць, прынесіць на свае градкі, насыпіць і гаворыць: “А як агурцоў урадзілась, адгробу нет!”*[1]. Рэспандэнты згадвалі пра даволі спецыфічныя спосабы, якія дапамагалі стараверам у крадзяжах: *Каней кралі... а каней кралі ўсе. Маглі валінкі абуць, завясці на чардак, перакрашвалі. Малако кіпяцілі, каня аблівалі, і конь сівы, і не дакажаш!*[2] Лічылася, што гэтыя пазапраўныя дзеянні старавераў «легалізаваліся» іх традыцыяй (і рэлігіяй) пасля выканання некаторых «рытуалаў» – «паклонаў» ці «перабірання шарыкаў»: *Такія былі ў іх... кругленькія шарычкі. Вот ён сядзіць шарычкі <перабіраіць>. <...> Называліся ў іх лесенкі. А ў нас тут радам маскалі былі. Так вот сорак етых шарычкаў у руках перадзяржаць... І хоць і бацьку заб’ець* [ТМКБ 2004, 782].

### Рэлігія і вера

У фарміраванні гэтай спецыфічнай групы насельніцтва Беларускага Падзвіння вялікую ролю адыгрывалі рэлігійныя перакананні, якіх насельніцтва прытрымлівалася на працягу некалькіх стагоддзяў. Яны лічылі сваю стараверскую веру самай што ні на ёсць «правільнай», а сябе называлі «истинно верующими» ў адрозненне ад іншых праваслаўных, якія прытрымваліся кананічных поглядаў.

> Гавораць [стараверы. – *У. А.*], адкалоліся мы ад іх. Яны нас шчыталі, што мы няправільна богу молімся. Яны ўжо правільна маліліся, а мы няправільна[3].
>
> Тут былі маскалі. <...> А Бог іх знаець, яны сябе счыталі, што яны самыя чыстыя, наверна. Некалі мама мая расказывала, гэта, была такая дзярэўня Навіны,

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад Е. М. Балашэўскай, 1928 г. н., у в. Саладухі Шумілінскага р-на.

[2] Зап. У. С. Філіпенкам, М. Протас у 2007 ад Г. А. Кажан, 1933 г., у Лепельскім р-не.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад В. С. Варкулевіч, 1921 г. н., у в. Вайловічы Шумілінскага р-на.

> там дзве хаты было, дык яны самі сябе счыталі, што гэта яны чыстыя, а тыя як бы паганыя нейкія[1].
>
> Ну, яны не ругаліся. Ну, Богу верылі, толькі што вот маскоўскія гэты, як гэта маскалі: «Ну, я ж чыстая, я чыстая праваслаўленная»[2].

У XIX ст., як паведамляюць крыніцы, прыхільнікі старых абрадаў даволі нецярпіма ставіліся да іншых канфесій – як да каталіцтва, так і да праваслаўя, хоць адрозненні з апошнім не былі такімі прынцыповымі. Як пазначаюць даследчыкі, у XIX ст. адносіны стараавераў да беларускага насельніцтва былі рознымі ў залежнасці ад сагласу старавераў і рэгіёна. Найбольш цярпіма ставіліся да мясцовага насельніцтва папоўцы [Канфесіі 1998, 98]. Самым негатыўным стаўленнем да «нестараавераў» вызначаліся больш радыкальныя накірункі беспапоўцаў. Але і адносіны беспапоўцаў у розных месцах Віцебскай губерні таксама не былі аднолькавымі: «Рэжыцкага, Люцынскага, Себежскага і Невельскага паветаў раскольнікі пазбягаюць зносін з праваслаўнымі; Дынабургскага павета раскольнікі даволі прыязныя да праваслаўных; тыя ж, што пражываюць у Полацкім павеце, як спаварочаныя большай часткай з адзінаверства, варожыя не толькі да праваслаўных, але і да адзінаверцаў» [ОВГ 1891, 65]. Паводле афіцыйных звестак, найбольш негатыўна адносіліся да мясцовага праваслаўнага насельніцтва прыхільнікі «...самай вялікай па колькасці і па ўнутранай сіле федасееўскай [секце], у якой ад маскоўскіх федасееўцаў у апошні час пачала прывівацца шкодная ерась – «бракоборство». Сутнасць ілжэвучэнняў гэтай ерасі, якая налічвае 83 сям'і, заключаецца ў поўным адмаўленні не толькі таемстваў, але і асноў сямейнага жыцця, – прызнаючы праваслаўнага і нават іншага кшталту расколу нашчадкамі антыхрыста» [ОВГ 1885, 20–21]. Самае ж нецярпімае стаўленне было ў старавераў да праваслаўнага духавенства і цывільнага кіраўніцтва: «Калі ж да ўсяго гэтага дадаць яшчэ неабмежаванасць даверу раскольнікаў да сваіх настаўнікаў і, наадварот, самае ўпартае і нават злоснае стаўленне да праваслаўнага духавенства і свецкага кіраўніцтва, якое доўжыцца з пачатку распаўсюджвання расколу... то цалкам будзе зразумелая цяжкасць барацьбы з расколам» [ОВГ 1891, 66–67].

Рэлігійная дыстанцыя станавілася перашкодай усталявання больш цесных побытавых сувязей. Асноўныя правілы жыцця старавераў-федасееўцаў Беларусі, выпрацаваныя ў сярэдзіне XVII ст. на так званым польскім саборы[3], аддзялілі іх ад мясцовага насельніцтва. Паводле гэтых правілаў, старавeрам забаранялася піць «гарэлае» віно «ад рук жыдоўскіх і ад няверных», мыцца ў лазнях разам з нехрышчонымі і іншаверцамі, карыстацца адным

[1] Зап. Т. В. Валодзінай, У. А. Лобачам у 2017 г. ад Р. В. Дубоўскай, 1943 г. н., у в. Пуканаўка Полацкага р-на.

[2] Зап. Т. В. Валодзінай, У. А. Лобачам у 2017 г. ад Н. Ф. Лясоўскай, 1934 г. н., у в. Заазер'е Полацкага р-на.

[3] Польскі сабор – сабор старавераў, які адбыўся ў сярэдзіне XVII ст. у Гудзішках Навааляксандраўскага павета. На саборы былі выпрацаваны, узгоднены і зацверджаны асноўныя палажэнні жыцця старавераў [Гарбацкі 1999, 74].



Драўляны крыж на могілках в. Ніўнікі Мёрскага р-на. 2021 г. Фотаздымак аўтара

посудам [Гарбацкі 1999, 74]. Апошняя забарона абавязвала стараавераў мець асобны посуд для іншаверцаў. Ва ўспамінах мясцовага беларускага насельніцтва такая асаблівасць знайшла адлюстраванне ў шэрагу наратываў пра так званую паганую кружку, што пацвярджаецца і сучаснымі палявымі даследаваннямі.

Адзельная кружка, такі палонік, «чарпак» у ніх называўся. Гэта, гавораць, беларуская кружка, «паганая»[1].

Дужа яны не прызнавалі. Я, як прышла замуж, дык на калодзежы вісела вядро замкнутае. І калі захочыш папіць, яны другую кружку давалі. – А як тая кружка звалася? – Паганая[2].

Адным з важных крытэрыяў, на аснове якіх адбываецца характарыстыка міжэтнічных (і міжканфесійных) адносінаў, з'яўляюцца змешаныя шлюбы. Як адзначаюць даследчыкі XIX – пачатку XX ст., шлюбы паміж старaверамі і мясцовым насельніцтвам амаль не заключаліся: «Ад акружаючага іх насельніцтва яны [старaверы. – *У. А.*] трымацца асобна, не роднячыся з імі шляхам шлюбу» [Витебская губерния 1890, 284–285]. Але ўсё ж такія выпадкі мелі месца: «Асабліва шкодных праяў расколу ў справаздачным годзе [1896. – *У. А.*] не было толькі з прычыны пазапраўнага супражывання раскольнікаў з праваслаўнымі (шлюбы па раскольніцкіх абрадах) было 12 выпадкаў адпадзення праваслаўных у раскол, але ва ўсіх гэтых выпадках прынятыя належныя меры да звароту адпаўшых ва ўлонне праваслаўнай царквы» [ОВГ 1896, 48]. У пераважнай большасці гэта адносіцца да жаночай паловы старaверскага насельніцтва: «Яшчэ маладзіцы-стараабрадкі іншы раз выходзяць замуж за беларусаў і латышоў, мужчыны ж ніколі не бяруць сабе жонак з іншых народнасцяў» [Витебская губерния 1890, 284–285]. Але часам і мужчыны-старaверы бралі сабе ў жонкі мясцовых дзяўчат:

Калі не апорай, то, прынамсі, памагатым у распаўсюджванні расколу служаць яшчэ шлюбы раскольнікаў з праваслаўнымі дзяўчынамі шляхам звычайнага выкрадання першымі апошніх па загадзя зробленай дамоўленасці паміж імі на гэта, якія практыкуюцца ў Дынабургскім і Рэжыцкім паветах. Патрапіўшы, такім

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад В. С. Варкулевіч, 1921 г. н., у в. Вайловічы Шумілінскага р-на.

[2] Зап. У. А. Лобачам у 2008 г. ад А. К. Сакалоўскай, 1939 г. н., у в. Кастрыца Лепельскага р-на.

чынам, у асяроддзе раскольнікаў, праваслаўная маладая жанчына паступова адвыкае ад праваслаўя і незаўважна, але немінуча адхіляецца ў раскол. ...Дзеці такой пары, хоць, па патрабаванні грамадзянскай улады, і бываюць хрышчоныя праваслаўным святаром, але застаючыся ў бацькоў, па-за пастаянным наглядам з боку праваслаўнага духавенства, міжволі становяцца раскольнікамі [ОВГ 1891, 66].

Забарона на змешаныя шлюбы была пашыраная ў вясковым соцыуме рэгіёна яшчэ ў сярэдзіне XX ст. (асабліва ў Заходняй Беларусі):

Я магла танцаваць з маскалямі і танцавала, і мяне праводзіў [старавер. – *У. А.*] з дзярэўні з танцаў і яе. Толькі да кладбішча. Но жэнітца – ані не. Ні разрышалі сваім сыноўям браць каталічку... Ну і нам гэта было сказана: за маскаля ні пойдзеш[1].

Канфесійныя адрозненні адыгралі істотнае месца ў фарміраванні вобраза старавераў. Даволі падрабязна гэтая праблематыка на аснове матэрыялаў сучасных палявых даследаванняў разгледжана ў артыкуле М. Антропава, А. Боганевай і Т. Валодзінай [Антропаў 2007]. Таму ў дадзенай працы ахарактарызуем толькі асноўныя аспекты. Разыходжанні ў рэлігійнай сферы паміж староверамі і мясцовым (праваслаўным і каталіцкім) насельніцтвам разглядаліся як найбольш значныя і прынцыповыя. Як вынікае з аналізу сучасных палявых матэрыялаў, паводле меркаванняў беларусаў, яны праяўляліся амаль выключна ў асаблівасцях культу і правядзенні богаслужэння: *Яны ні так і богу* [моляцца. – *У. А.*] *і хароняць ні так*[2]; *Староверы моляцца двум пальцамі, цягнуць у нос*[3]. Але часам магла пазначацца і прынцыповая розніца ў пытаннях веры: *Ну, маскальская вера, ні праваслаўная, ні каталіцкая, ні мусульманская, а можа гэта да мусульман было*[4]; *...но ані* [староверы. – *У. А.*] *не праваслаўнай веры, у ніх старая, руская, а я – праваслаўнай веры іспавіданія*[5]. У той жа час фіксуюцца ўяўленні аб тым, што іх вера мала адрозніваецца (гл. ніжэй) і нават пра тое, што ў старавераў «самая першая вера»: *Ай ну як па-прастому ходзяць – маскалі. <...> Гэта староверы. Гэта самая первая вера. Староверы яны завуцца*[6]. Даволі часта ва ўмовах сучаснага грамадства набожнасць старавераў выклікае павагу сярод рэспандэнтаў каталіцкага і праваслаўнага веравызнання:

Ну по вере. Вера. У ніх своя, у нас своя вера. Яны сейчас сваей верай дзяржацца. <...> Яны такіе, веруюшчые, да. Празднікі свої давнішніе отмечалі, цепер отмечают давнейшніе, старшые[7].

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад А. Д. Пятроўскай, 1935 г. н., у в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.

[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам і У. С. Філіпенкам у 2005 г. ад А. М. Дзягілевай, 1912 г. н., у в. Пятніцкае Шумілінскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад Г. Ф. Лапуновай, 1923 г. н., у в. Непароты Шумілінскага р-на.

[4] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад М. В. Ластоўскай, 1931 г. н., у в. Глінішчына Пастаўскага р-на.

[5] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад А. Д. Пятроўскай, 1935 г. н., у в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.

[6] Зап. В. Лях, А. Нешчарэтам у 2008 г. ад Я. І. Адзянец, 1932 г. н., у в. Юзэфова Шаркаўшчынскага р-на.

[7] Зап. Ю. І. Згірскім, А. С. Юлдашевым, Д. І. Бабоўскім у 2021 г. ад Т. П. Дарожка, 1938 г. н., у в. Дзедкавічы Браслаўскага р-на.



Стараверская царква Успення Прасвятой Багародзіцы ў Відзах у 1950-я гг. (Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. – Ф. 645. – Воп. 1. – Спр. 4)

Для прадстаўнікоў традыцыйнага грамадства ва ўяўленнях аб «сваёй»/«чужой» веры і «сваім»/«чужым» народзе прыкмета канфесійнасці часта атаясамліваецца з прыкметай этнічнасці. У такім выпадку адбываецца зрастанне паняццяў «свая група» (этнас) і «вера» і назіраецца прывязка этнічнай намінацыі да намінацыі канфесійнай. Шырокія кантакты, у большай ступені толькі са стараверамі, як прадстаўнікамі рускага этнасу, нараджалі ў беларусаў (праваслаўнага веравызнання) перакананне пра тое, што праваслаўная вера – вера беларуская, а рускай з'яўляецца «стараверская» вера. Такія ўяўленні захаваліся і да нашага часу: *Ну маліліся яны* [староверы. – *У. А.*] *не так... Яны ж рускай веры... эта ж рускія. Мы – беларускай, мы – беларускія, а ані рускія*[1].

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад В. С. Варкулевіч, 1921 г. н., у в. Вайловічы Шумілінскага р-на.

Многія рэлігійныя традыцыі старавераў у мясцовага насельніцтва расцэньваюцца як нязвыклыя, і на іх пастаянна звяртаюць увагу рэспандэнты-беларусы. Асабліва гэта датычыцца спецыфікі богаслужэння і рэлігійных абрадаў.

> Ага. Мы прынімаем прычасціе, так, а ў іх нет гэтага. Так, гэта вот раз, а тады, па-другое, ну тока ў іх ужо нарэч'е другое, а так еслі дзе там біваіць пойдзець пакойнік ці што ну і так жа ж я знаю, так тое самае, і малітвы, толька ўжо ў іх маціў. Яны па-другому, а ў нас болі меладзічна пают праваслаўныя, казаў тут, што ўсё[1].

Асаблівы каментарый атрымалі традыцыі пахавання стараверaў рэгіёна.

> – А чаго хрэст у галавах ставяць? – У нас, у праваслаўных, так ставяць. У галавах хрэст. А ў маскалей – у нагах. А цяпер як маскалёў ложаць – нагамі к іконе, а галавой у парог. А ў нас наабарот, у праваслаўных[2].
>
> Нада непрыменна і хароняць некрасіва... У нас покойніка одзеваюць, а ў іх не знаю, есть там што адзето ілі не, но такі накінуты халат – балахон і все. Вот. І закрыты ўвесь цюлямі ён[3].

У мясцовага беларускага насельніцтва неразумене выклікала і традыцыя завешваць іконы, якія размяшчаліся ў хатах стараверaў: *У іх іконы, вот, як кармушкі у кароў. Не, праўда. Во так во трохугольнік ... Там ікона, і тады тут завешана. Вот эта я знаю. Я там ужэ не помню канкрэтна, но вот іменна вот угал... У нас такова вот нету*[4]. Рэспандэнты часам звяртаюць увагу на спецыфічны выгляд старaверскага храма: *Ага ў Лучыі старaверы былі, у іх была, кірка звалася, у нас царква називаецца, а ў каталікоў касцёл, ну гэты гэту кірку разабралі, а на гэтай кірка быў пятух, вот стаяў; гэта кірка іх царква, а на верху такая піка стаяла, а на гэтай піке пятух быў*[5].

Сучасныя палявыя даследаванні паказваюць, што такая важная прыкмета, як рэлігія, губляе сваё значэнне пры самаідэнтыфікацыі прадстаўнікоў гэтай этнаканфесійнай групы. Рэлігійныя адрозненні пачынаючы з сярэдзіны XX ст. сталі паступова сціраца, не назіраецца таксама ранейшай прынцыповасці ў пытаннях веры. Пра гэта адзначаюць і самі старaверы: *У нас с православнымі много обшчіх празніков і обрядов, все мы под однім Богом ходім*[6]. Рэлігійныя адрозненні нават не становяцца перашкодай для наведавання праваслаўных храмаў: *Давеча ў Буеўшчыну* <дзе знаходзіцца маленны дом стараабрадцаў> *не пайшла – сілы нет. Пайшла сюды ў цэркав. – У праваслаўную? Да. Якая разніца? <...> Эта ж адно і то жа* [ТМКБ 2004, 788]. Назіраецца і пераход маладога пакалення ў праваслаўе (шляхам хрышчэння малых дзяцей у праваслаўных храмах і г. д.), асабліва, калі яно жыве ў іншаканфесійным акружэнні і дзе

---

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2008 г. ад Л. Ф. Марковіч, 1925 г. н., у в. Перабродзе Мёрскага р-на.

[2] Зап. У. А. Лобачам у 2008 г. ад Л. Н. Паўлоўскай, 1938 г. н., у в. Млын Лепельскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2008 г. ад І. А. Шклявавай у в. Ніўнікі Мёрскага р-на.

[4] Зап. Я. Л. Навічонкам і А. Волкавым у 2003 г. ад А. Р. Трэшчанка, 1925 г. н., З. В. Зяленскай, 1930 г. н., В. І. Валеўскай, 1938 г. н., у в. Заенкі Полацкага р-на.

[5] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад З. К. Трапук, 1923 г. н., у в. Гліншчына Пастаўскага р-на.

[6] Зап. Я. Л. Навічонкам у 2005 г. ад В. Д. Рыбаковай, 1930 г. н., у в. Слабодка Браслаўскага р-на.

адсутнічаюць стараверскія малельні і храмы: *Цяпер ужо унукі хресцюць у праваслаўны ўсіх сваіх, таму што у нас трудна. У нас ня вучаць бацюшку, у нас самавучкай былі*[1]. Страчваюць сваю сілу ранейшыя забароны, напрыклад, адносна палення тытуню: *Курыць то ні курылі, старэйшыя, а цяперака маладыя кураць*[2]. Паступова знікаюць і забароны стараверaў на сумеснае спажыванне ежы і піццё з аднога посуду з іншаверцамі: *А ціпер усё роўна. Пі, ядуць і ядуць усё ўмесце, ціперака ні разбіраюцца*[3].

Матэрыялы сучасных палявых даследаванняў у рэгіёне фіксуюць знікненне этнічнай дыстанцыі ва ўзаемадзеянні мясцовага беларускага насельніцтва і рускіх стараверaў: *А гэтыя маладыя ўжо сайдзініліся разам, роўна было*[4]; *А як са стараверамі? – Ні нада лепшых, ні нада лепшых. Наш ужо горшы быў*[5]. Адным з паказчыкаў этнічнага збліжэння стараверaў і мясцовага беларускага насельніцтва з'яўляецца павелічэнне колькасці змешаных шлюбаў, якое назіраецца ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Як зазначаюць рэспандэнты, такія шлюбы сталі досыць пашыранай з'явай ужо ў сярэдзіне XX ст.: *І Садок узяў каталічку, і Ціток. <...> После, после!*[6]

Адасобленасць стараверaў, якая існавала найперш, па прычыне рэлігійнай адрознасці, не станавілася перашкодай для актыўнага міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў сферы каляндарнай святочнай культуры. У першую чаргу гэта адносіцца да каляндарных абрадаў, якія маюць асабліва важнае значэнне ў абедзвюх традыцыях. Гэта праяўлялася ў тым, што стараверскія сядзібы былі ўключаныя ў прасторавую структуру рытуальных валачобных і калядных абыходаў [ТМКБ 2004, 788; Земляробчы каляндар 2003, 184]. На Заходнім Падзвінні беларусы-калядоўшчыкі каталіцкага веравызнання заходзілі не толькі да «сваіх» (адзінаверцаў), але і да стараверaў, у якіх свята Нараджэння Хрыстова святкуецца пазней, а ў гэты час яшчэ ідзе Піліпаўскі пост. Тым не менш іх прымалі, давалі падарункі – аказвалі павагу «людзям са свету» [ТМКБ 2004, 788]. А ўключэнне стараверскіх дамоў у прастору калядных і валачобных абыходаў сведчыць пра тое, што ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў стараверскія сядзібы выступалі хоць і спецыфічнай, але неад'емнай часткай «свайго» свету. У в. Іказнь Браслаўскага р-на старaверы і мясцовае беларускае насельніцтва (каталіцкага веравызнання) даволі часта запрашалі адзін да аднаго на куццю [ТМКБ 2004, 788]. Гэтыя прыклады міжэтнічнага ўзаемадзеяння ў сферы каляндарнай абраднасці яскрава характарызуюць сапраўднае добрасуседства беларусаў і стараверскага насельніцтва на Падзвінні.

---

[1] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад Т. Д. Лукашонак (Мінавай), 1920 г. н., у в. Лучай Пастаўскага р-на.

[2] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад Л. І. Шыдлоўскай, 1924 г. н., у в. Гліншчына Пастаўскага р-на.

[3] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2005 г. ад В. С. Варкулевіч, 1921 г. н., у в. Вайловічы Шумілінскага р-на.

[4] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад Л. І. Шыдлоўскай, 1924 г. н., у в. Гліншчына Пастаўскага р-на.

[5] Зап. У. Я. Аўсейчыкам у 2007 г. ад М. В. Ластоўскай, 1931 г. н., у в. Гліншчына Пастаўскага р-на.

[6] Зап. Аўсейчыкам У. Я. у 2007 г. ад А. Д. Пятроўскай, 1935 г. н., у в. Гаўрылавічы Пастаўскага р-на.

**Высновы.** Такім чынам, падсумоўваючы аналіз фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў, можна зрабіць наступныя высновы. На тэрыторыі Беларускага Падзвіння ўжо з другой паловы XVII ст. пражывае значная колькасць рускіх старавераў, адносна якіх у народнай культуры беларусаў склаўся досыць спецыфічны вобраз. Істотнае значэнне ў яго фарміраванні адыгралі рэлігійны фактар, а таксама ізаляваны і замкнёны лад старавераў. Для мясцовага беларускага насельніцтва рэгіёна важнае значэнне пры характарыстыцы «чужакоў» мела таксама іх гаспадарчая дзейнасць, асаблівасці мовы, побыту і абраднасці. Стараверы праявілі сябе як добрыя земляробы, рамеснікі і гандляры, чым заслужылі павагу з боку мясцовага насельніцтва. У якасці станоўчых рыс іх побытавай культуры пазначалася забарона палення тытуню, рэгламентацыя спажывання алкаголю, абавязковае выкананне дадзенага слова і строгае выкананне пастоў. Але разам з тым некаторым катэгорыям старавераўскага насельніцтва прыпісваліся і чараўніцкія здольнасці, крытыкаваўся спрошчаны характар заключэння шлюбу і ігнараванне ўласніцкіх правоў карэннага насельніцтва. Але неабходна зазначыць, што многія ўяўленні як у адносінах да стараверaў, так і да мясцовага беларускага насельніцтва, прыпісваліся і прадстаўнікам іншых этнічных супольнасцей і шмат у чым былі абумоўлены асаблівасцямі ўспрыняцця ва ўмовах традыцыйнага грамадства. Аналіз жа матэрыялаў сучасных палявых фальклорна-этнаграфічных даследаванняў у рэгіёне сведчыць пра тое, што пачынаючы з сярэдзіны XX ст. ва ўзаемадзеянні беларусаў і рускіх стараверaў істотна памяншаюцца этнічная і канфесійная дыстанцыі, а ўзаемаадносіны характарызуюцца добрасуседствам.

## Спіс выкарыстаных крыніц

АІМЭФ – Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 52. Этнаграфічная Гродзенска-Полацкая экспедыцыя АН БССР 1954 г. Запісы М. Я. Грынблата.

Антропаў 2007 – Антропаў, М. Этнаканфесійныя стэрэатыпы ў беларускай вёсцы (канец XX – пачатак XXI ст.) / М. Антропаў, А. Боганева, Т. Валодзіна // Беларус. гіст. агляд. – 2007. – Т. 14. – С. 141–178.

Аўсейчык 2008 – Аўсейчык, У. Я. Вобраз стараверaў у народнай культуры беларусаў Падзвіння ў XIX – першай палове XX ст. / У. Я. Аўсейчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – Вып. 5. – С. 316–322.

Аўсейчык 2019 – Аўсейчык, У. Я. Стараверы Беларускага Падзвіння ў канцы XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці рассялення і ўзаемадзеяння з мясцовым насельніцтвам / У. Я. Аўсейчык // Религия и общество – 13 : сб. науч. ст. / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2019. – С. 175–178.

Аўсейчык 2018 – Аўсейчык, У. Я. Стараверы Шуміліншчыны ва ўяўленнях беларускага насельніцтва (па матэрыялах сучасных палявых этнаграфічных экспедыцый) / У. Я. Аўсейчык // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Шумілінскі край : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – С. 18–28.

Аўсейчык 2007 – Аўсейчык, У. Я. Этнаканфесіянальныя стэрэатыпы ў беларускім традыцыйным грамадстве XIX – пачатку XX ст. / У. Я. Аўсейчык // Европа: актуальные проблемы этнокультуры / редкол.: В. В. Тугай [и др.]. – Минск : БГПУ, 2007. – С. 228–230.

Баршчэўскі 1998 – Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі.– Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

Без-Корнилович 1855 – Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – СПб. : Тип. III Отд. Собст. Е. И. В. Канцелярии, 1855. – 355 с.

Борисёнок, Лобач 2002 – Борисёнок, Ю. Восточный сосед. Образ русского в белорусской традиционной культуре / Ю. Борисёнок, В. Лобач // Родина. – 2002. – № 7. – С. 46–49.

Валодзіна 2004 – Валодзіна, Т. Барада / Т. Валодзіна, Э. Зайкоўскі // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўн. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 42–43.

Витебская губерния 1890 – Витебская губерния: историко-географический и статистический обзор. Вып. 1. История. Природа. Население. Просвещение / сост. по программе и под ред. В. М. Долгорукова. – Витебск : Губ. тип., 1890. – 387 с., [18 л.].

Віцьбіч 2007 – Віцьбіч, Ю. Антыбальшавіцкія паўстанні і партызанская барацьба на Беларусі / Ю. Віцьбіч. – Вільня : Gudas, 2007. – 308 с.

Гарбацкі 1999 – Гарбацкі, А. А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст. / А. А. Гарбацкі. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.

Горбачевский 1895 – Горбачевский, И. Д. Лепельский уезд Витебской губернии / И. Д. Горбачевский. – Витебск : Губ. тип., 1895. – 38 с.

Захаркевіч 2016 – Захаркевіч, С. А. Паўсядзённая культура «старавераў» у беларуска-латышска-літоўскім памежжы (на падставе палявых этнаграфічных матэрыялаў) / С. А. Захаркевіч, Ю. І. Внуковіч // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Браслаўскія чытанні (да 950-годдзя горада Браслава): зб. навук. арт. – Мінск, 2016. – С. 157–167.

Земляробчы каляндар 2003 – Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 429 с.

Іваноў 2006 – Іваноў, У. Мясцовыя назвы Віцебскіх старавераў / У. Іваноў // Роднае слова. – 2006. – № 12 (228). – С. 31.

Іваноў 2008 – Іваноў, У. Пра беларускі ўплыў на віцебскіх стараверaў / У. Іваноў // Палітычная сфера. – 2008. – № 10. – С. 102–107.

Іваноў 2010 – Іваноў, У. Эвалюцыя тоеснасці і культуры стараверaў паўночнай Беларусі, канец XIX – пачатак XXI стагоддзя / У. Іваноў // Палітычная сфера. Часоп. паліт. даслед. – 2010. – № 14. – С. 195–210.

Канфесіі 1998 – Канфесіі на Беларусі (к. XVIII – XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

Киркор 1994 – Киркор, А. Народная жизнь / А. Киркор // Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Минск : Беларус. энцыкл., 1994. – С. 277–288.

Лобач 2003 – Лобач, У. А. Вобраз «асташа» (старавера) у творах Яна Баршчэўскага / У. А. Лобач // Старообрядчество как историко-культурный феномен : материалы Междунар. науч.-практ. конф. – Гомель : ГГУ, 2003. – С. 161–166.

Лобач 2009 – Лобач, У. А. Латвія і латышы ў традыцыйнай карціне свету беларусаў Падзвіння XIX – першай паловы XX стагоддзя / У. А. Лобач // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2009. – № 7. – С. 51–60.

Максимов 1994 – Максимов, С. В. Белорусская Смоленщина с соседями / С. В. Максимов // Живописная Россия. Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Минск : Беларус. энцыкл., 1994. – С. 429–472.

Минина 2001 – Минина, Н. Е. Говор и материальная культура старообрядцев Витебщены (ареальный аспект) / Н. Е. Минина // Белорусское Поозерье: язык и духовная культура. – Минск, 2001. – С. 135–151.

Никифоровский 1896 – Никифоровский, Н. Я. Питущие и пропойцы / Н. Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1896. – № 4. – С. 65–88.

Никифоровский 1893 – Никифоровский, Н. Я. Пособники жихара / Н. Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1893. – № 2. – С. 92–154.

ОВГ 1885 – Обзор Витебской губернии за 1885 г. – Витебск : Губ. тип., 1885. – 40 с.

ОВГ 1891 – Обзор Витебской губернии за 1891 г. – Витебск : Губ. тип., 1892. – 141, 27 с.

ОВГ 1896 – Обзор Витебской губернии за 1896 г. – Витебск : Губ. тип.-лит., 1897. – 127, 106 с.

Овсейчик 2019 – Овсейчик, В. Е. Старообрядцы Белорусского Подвинья в XIX – начале XX в.: особенности расселения и этнической культуры / В. Е. Овсейчик // Старообрядчество: история, культура, современность : материалы XIII Междунар. науч. конф., Москва, 21–23 нояб. 2019 г. ; гл. ред. В. И. Осипов. – М., 2019. – С. 167–71.

Отчет 1889 – Отчет епархиального мессионера о его миссионерской деятельности в ноябре и декабре месяцах 1888 г. // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1889. – № 5. – 1 марта. – С. 202–220.

Посох 1895 – Посох, Г. Видзы / Г. Посох. – Ковно : Тип. губ. правл., 1895. – 13 с.

Романов 1912 – Романов, Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8–9: Быт белоруса. Словарь условных языков / Е. Р. Романов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – 724 с.

Россия 1905 – Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. – СПб.: Изд. А. Ф. Девриена, 1905. – Т. 9: Верхнее Поднепровье и Белоруссия / сост. В. П. Семенов [и др.]. – VIII, 620 с.

Русские 2005 – Русские / Отв. ред. В. А. Александров, И. В. Власова, Н. С. Полищук. – М. : Наука, 2005. – 828 с.

Сементовский 1872 – Сементовский, А. Этнографический обзор Витебской губернии / А. Сементовский. – СПб. : Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.

Станкевич 1909 – Станкевич, А. Очерк возникновения русских поселений на Литве / А. Станкевич. – Вильна : Губ. тип., 1909. – 140 с.

ТМКБ 2004 – Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка. – 910 с.

Філіпенка 2003 – Філіпенка, У. С. Вясельная абраднасць старавераў-беспапоўцаў Беларусі (па этнаграфічных матэрыялах апошняй чвэрці XIX стагоддзя) / У. С. Філіпенка // Старообрядчество как историко-культурный феномен : материалы Междунар. науч.-практ. конф. – Гомель : ГГУ, 2003. – С. 283–288.

Фрэйзэр 2003 – Фрэйзэр, А. Цыганы / А. Фрэйзэр. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 272 с.

## References

AIMEF – Archiŭ Instytuta mastactvaznaŭstva, etnahrafii i faĺkloru NAN Bielarusi [Archive of the Institute of Art History, Ethnography and Folklore of the National Academy of Sciences of Belarus]. – F. 6. Vop. 3. Spr. 52. Etnahrafičnaja Hrodzienska-Polackaja ekspiedycyja AN BSSR 1954 h. Zapisy M. Ja. Hrynblata [Ethnographic Grodno-Polotsk Expedition of the Academy of Sciences of the BSSR in 1954. Records of M. JA. Hrynblat]. [in Belarusian]

Antropaŭ 2007 – Antropaŭ, M. Etnakanfiesijnyja stereatypy ŭ bielaruskaj vioscy (kaniec XX – pačatak XXI st.). [Ethno-confessional stereotypes in the Belarusian village (late XX – early XXI century)] / M. Antropaŭ, A. Bohanieva, T. Valodzina // Bielarus. hist. ahliad [Belarusian historical review]. – 2007. – Vol. 14. – P. 141–178. [in Belarusian]

Aŭsiejčyk 2008 – Aŭsiejčyk, U. JA. Vobraz staravieraŭ u narodnaj kuĺtury bielarusaŭ Padzvinnia ŭ XIX – pieršaj palovie XX st. [The image of the Old Believers in the folk culture of the Belarusians of Podvina in the XIX – first half of the XX century.] / U. Ja. Aŭsiejčyk // Pytanni mastactvaznaŭstva, etnalohii i faĺklarystyki [Issues of art history, ethnology and folklore]. – Minsk : Prava i ekanomika, 2008. – Vyp. 5. – P. 316–322. [in Belarusian]

Aŭsiejčyk 2019 – Aŭsiejčyk, U. JA. Staraviery Bielaruskaha Padzvinnia ŭ kancy XIX – pačatku XX st.: asablivasci rassialiennia i ŭzajemadziejannia z miascovym nasieĺnictvam [Old Believers of the Belarusian Dvina in the late XIX – early XX centuries: features of settlement and interaction with the local population] / U. JA. Aŭsiejčyk // Religiia i obshchestvo – 13 : sb. nauch. st. [Religion and Society – 13] / ed. V. V. Starostenko, O. V. D'iachenko. – Mogilev : MGU im. A. A. Kuleshova, 2019. – P. 175–178. [in Belarusian]

Aŭsiejčyk 2018 – Aŭsiejčyk, U. Ja. Staraviery Šumilinščyny va ŭjaŭlienniach bielaruskaha nasieĺnictva (pa materyjalach sučasnych paliavych etnahrafičnych ekspiedycyj) [Old Believers of the Shumilin Region in the Representations of the Belarusian Population (Based on the Materials of Modern Field Ethnographic Expeditions)] / U. Ja. Aŭsiejčyk // Bielaruś praz pryzmu rehijanaĺnaj historyi: Šumilinski kraj : zb. navuk. art. / Nac. akad. navuk Bielarusi, In-t historyi ; ed.: V. V. Danilovič. – Minsk : Belarus. navyka, 2018. – P. 18–28. [in Belarusian]

Aŭsiejčyk 2007 – Aŭsiejčyk, U. Ja. Etnakanfiesijanaĺnyja stereatypy ŭ bielaruskim tradycyjnym hramadstvie XIX – pačatku XX st. [Ethno-confessional stereotypes in the Belarusian traditional society of the XIX – early XX centuries] / U. Ja. Aŭsiejčyk // Evropa: aktual'nye problemy etnokul'tury [Europe: current ethnocultural issues] / ed.: V. V. Tugai [i dr.]. – Minsk : BGPU, 2007. – P. 228–230. [in Belarusian]

Barščeŭski 1998 – Barščeŭski, JA. Vybranyja tvory [Selected works] / Ja. Barščeŭski. – Minsk : Bielarus. knihazbor, 1998. – 480 s. [in Belarusian]

Bez-Kornilovich 1855 – Bez-Kornilovich, M. O. Istoricheskie svedeniia o primechatel'neishikh mestakh v Belorussii s prisovokupleniem i drugikh svedenii k nei zhe otnosiashchikhsia [Historical information about the most remarkable places in Belorussia with the addition of other information related to it] / M. O. Bez-Kornilovich. – SPb. : Tip. III Otd. Sobst. E. I. V. Kantseliarii, 1855. – 355 p. [in Russian]

Borisenok, Lobach 2002 – Borisenok Yu. Vostochnyi sosed. Obraz russkogo v belorusskoi traditsionnoi kul'ture [Eastern neighbour. The image of the Russian in Belarusian traditional culture] / Yu. Borisenok, V. Lobach // Rodina [Homeland]. – 2002. – № 7. – P. 46–49. [in Russian]

Valodzina 2004 – Valodzina, T. Barada [Beard] / T. Valodzina, E. Zajkoŭski // Bielaruskaja mifalohija: encyklap. sloŭnik [Belarusian mythology: an encyclopedic dictionary]. – Minsk : Belarus', 2004. – P. 42–43. [in Belarusian]

Vitebskaia guberniia 1890 – Vitebskaia guberniia: istoriko-geograficheskii i statisticheskii obzor. Vyp. 1. Istoriia. Priroda. Naselenie. Prosveshchenie [Vitebsk province: historical, geographical and statistical overview. Vol. 1. History. Nature. Population. Enlightenment] / sost. po programme i pod red. V. M. Dolgorukova. – Vitebsk : Gub. tip., 1890. – 387 p., [18 l.]. [in Russian]

Vićbič 2007 – Vićbič, Ju. Antybaĺšavickija paŭstanni i partyzanskaja baraćba na Bielarusi / Ju. Vićbič. – [Anti-Bolshevik uprisings and guerrilla struggle in Belarus] / Ju. Vićbič. – Viĺnia : Gudas, 2007. – 308 p. [in Belarusian]

Harbacki 1999 – Harbacki, A. A. Staraabradnictva na Bielarusi ŭ kancy XVII – pačatku XX stst. [Old Believers in Belarus in the late XVII – early XX centuries] / A. A. Harbacki. – Brest : BrDU, 1999. – 202 p. [in Belarusian]

Gorbachevskii 1895 – Gorbachevskii, I. D. Lepel'skii uezd Vitebskoi gubernii [Lepel county, Vitebsk province] / I. D. Gorbachevskii. – Vitebsk : Gub. tip., 1895. – 38 p. [in Russian]

Zacharkievič 2016 – Zacharkievič, S. A. Paŭsiadzionnaja kuĺtura “staravieraŭ” u bielaruska-latyšska-litoŭskim pamiežžy (na padstavie paliavych etnahrafičnych materyjalaŭ) [Everyday culture of «Old Believers» in the Belarusian-Latvian-Lithuanian border (based on field ethnographic materials)] / S. A. Zacharkievič, Ju. I. Vnukovič // Bielaruś praz pryzmu rehijanaĺnaj historyi: Braslaŭskija čytanni: (da 950-hoddzia horada Braslava): zb. navuk. art. [Belarus through the prism of regional history: Braslav readings (to the 950th anniversary of the city of Braslav)]: zb. navuk. art. – Minsk, 2016. – P. 157–167. [in Belarusian]

Ziemliarobčy kaliandar 2003 – Ziemliarobčy kaliandar: Abrady i zvyčai [Agricultural Calendar: Rites and Customs]. – 2-e vyd., vypr. – Minsk : Belarus. navuka, 2003. – 429 p. [in Belarusian]

Ivanoŭ 2006 – Ivanoŭ, U. Miascovyja nazvy Viciebskich staravieraŭ [Local names of Vitebsk Old Believers] / U. Ivanoŭ // Rodnae slova [Native word]. – 2006. – № 12 (228). – P. 31. [in Belarusian]

Ivanoŭ 2008 – Ivanoŭ, U. Pra bielaruski ŭplyŭ na viciebskich staravieraŭ [About the Belarusian influence on Vitebsk Old Believers] / U. Ivanoŭ // Palityčnaja sfiera. [Political sphere]. – 2008. – № 10. – P. 102–107. [in Belarusian]

Ivanoŭ 2010 – Ivanoŭ, U. Evaliucyja tojesnasci i kuĺtury staravieraŭ paŭnočnaj Bielarusi, kaniec XIX – pačatak XXI stahoddzia [The evolution of the identity and culture of the Old Believers of northern Belarus, the end of the XIX – the beginning of the XXI century] / U. Ivanoŭ // Palityčnaja sfiera. [Political sphere]. – 2010. – № 14. – P. 195–210. [in Belarusian]

Kanfiesii 1998 – Kanfiesii na Bielarusi (k. XVIII – XX st.) [Denominations in Belarus (late XVIII – XX centuries)] / V. V. Hryhorjeva [i inš.]. – Minsk : Ekapierspiektyva, 1998. – 340 p. [in Belarusian]

Kirkor 1994 – Kirkor, A. Narodnaia zhizn' [Folk life] / A. Kirkor // Zhivopisnaia Rossiia. Otechestvo nashe v ego zem., ist., plem., ekon. i byt. znachenii: Litovskoe i Belorusskoe Poles'e [Picturesque Russia. Our Homeland in its land, historical, tribal, economic and everyday meaning: Lithuanian and Belarusian Polesie]: Reprint. vosproizvedenie izd. 1882 g. – Minsk : Belarus. Encikl., 1994. – P. 277–288. [in Russian]

Lobač 2003 – Lobač, U. A. Vobraz «astaša» (staraviera) u tvorach Jana Barščeŭskaha [The image of «astash» (Old Believer) in the works of Jan Barščeŭski] / U. A. Lobač // Staroobriadchestvo kak istoriko-kul'turnyi fenomen [Old Believers as a historical and cultural phenomenon]: materialy mezhdunar. nauch.-prakt. konf. – Gomel' : GGU, 2003. – P. 161–166. [in Belarusian]

Lobač 2009 – Lobač, U. A. Latvija i latyšy u tradycyjnaj karcinie svietu bielarusau Padzvinnia XIX – pieršaj palovy XX stahoddzia [Latvia and Latvians in the traditional picture of the world of Belarusians in the Call of the XIX – first half of the XX century] / U. A. Lobač // Vestnik Polotskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriia A, Gumanitarnye nauki [Bulletin of Polotsk State University]. – 2009. – № 7. – P. 51–60. [in Belarusian]

Maksimov 1994 – Maksimov, S. V. Belorusskaia Smolenshchina s sosediami [Belarusian Smolensk with neighbours] / S. V. Maksimov // Zhivopisnaia Rossiia. Otechestvo nashe v ego zem., ist., plem., ekon. i byt. znachenii: Litovskoe i Belorusskoe Poles'e [Picturesque Russia. Our Homeland in its land, historical, tribal, economic and everyday meaning: Lithuanian and Belarusian Polesie]: Reprint. vosproizvedenie izd. 1882 g. – Minsk : Belarus. Encikl., 1994. – P. 429–472. [in Russian]

Minina 2001 – Minina, N. E. Govor i material'naia kul'tura staroobriadtsev Vitebshcheny (areal'nyi aspekt) [Speech and material culture of the Old Believers of Vitebsk (areal aspect)] / N. E. Minina // Belorusskoe Poozer'e: iazyk i duhovnaia kul'tura [Belarusian Poozerie: language and spiritual culture]. – Minsk, 2001. – P. 135–151. [in Russian]

Nikiforovskii 1896 – Nikiforovskii, N. Ya. Pitushchie i propoitsy [Drinkers and drunks] / N. Ya. Nikiforovskii // Etnograficheskoe obozrenie [Ethnographic review]. – 1896. – № 4. – P. 65–88. [in Russian]

Nikiforovskii 1893 – Nikiforovskii, N. Ya. Posobniki zhikhara [Gihar's accomplices] / N. Ya. Nikiforovskii // Etnograficheskoe obozrenie [Ethnographic review]. – 1893. – № 2. – P. 92–154. [in Russian]

OVG 1885 – Obzor Vitebskoi gubernii za 1885 g. [Review of the Vitebsk province in 1885.] – Vitebsk : Gub. tip., 1885. – 40 p. [in Russian]

OVG 1891 – Obzor Vitebskoi gubernii za 1891 g. [Review of the Vitebsk province in 1891.] – Vitebsk : Gub. tip., 1892. – 141, 27 p. [in Russian]

OVG 1896 – Obzor Vitebskoi gubernii za 1896 g. [Review of the Vitebsk province in 1896.] – Vitebsk : Gub. tip.-lit., 1897. – 127, 106 p. [in Russian]

Ovseichik 2019 – Ovseichik, V. E. Staroobriadtsy Belorusskogo Podvin'ia v XIX – nachale XX v.: osobennosti rasseleniia i etnicheskoi kul'tury [Old Believers of the Belorussian Podvinje in the 19th – early 20th centuries: peculiarities of settlement and ethnic culture] / V. E. Ovseichik // Staroobriadchestvo: istoriia, kul'tura, sovremennost' [Old Believers: History, Culture, Modernity]: materialy XIII Mezhdunar. nauch. konf., Moskva, 21–23 noiab. 2019 g. ; gl. red. V. I. Osipov. – M., 2019. – P. 167–171. [in Russian]

Otchet 1889 – Otchet eparkhial'nogo messionera o ego missionerskoi deiatel'nosti v noiabre i dekabre mesiatsakh 1888 g. [Report of the diocesan missionary on his missionary work during November and December 1888] // Polotskie eparkhial'nye vedomosti [Polotsk Eparchial Gazette]. – 1889. – № 5. – 1 marta. – P. 202–220. [in Russian]

Posokh 1895 – Posokh, G. Vidzy / G. Posokh. – Kovno : Tip. gub. pravl., 1895. – 13 p. [in Russian]

Romanov 1912 – Romanov, E. R. Belorusskii sbornik. Vyp. 8–9: Byt belorusa. Slovar' uslovnykh iazykov [Belarusian collection. Vol. 8–9: Gen. of the Belarusians. Dictionary of Conventional Languages] / E. R. Romanov. – Vil'na : Tip. A. G. Syrkina, 1912. – 724 p. [in Russian]

Rossiia 1905 – Rossiia. Polnoe geograficheskoe opisanie nashego Otechestva [Russia. A complete geographical description of our Fatherland]. – SPb. : izd. A. F. Devriena, 1905. – T. 9 : Verkhnee Podneprov'e i Belorussiia [Upper Podneprovie and Belorussia] / sost. V. P. Semenov [i dr.]. – VIII, 620 p. [in Russian]

Russkie 2005 – Russkie [Russians] / otv. red. V. A. Aleksandrov, I. V. Vlasova, N. S. Polishchuk. – M. : Nauka, 2005. – 828 p. [in Russian]

Sementovskii 1872 – Sementovskii, A. Etnograficheskii obzor Vitebskoi gubernii [Ethnographic overview of Vitebsk province] / A. Sementovskii. – SPb. : Tip. M. Hana, 1872. – 69 p. [in Russian]

Stankevich 1909 – Stankevich, A. Ocherk vozniknoveniia russkikh poselenii na Litve [Sketch of the emergence of Russian settlements in Lithuania] / A. Stankevich. – Vil'na : Gub. tip., 1909. – 140 p. [in Russian]

TMKB 2004 – Tradycyjnaja mastackaja kuĺtura bielarusaŭ: u 6 t. [Traditional artistic culture of Belarusians: in 6 volumes] – Minsk : Belarus. navuka, 2004. – T. 2 : Viciebskaje Padzvinnie / T. B. Varfalamiejeva, A. M. Bohanieva, M. A. Kozienka. – 910 p. [in Belarusian]

Filipienka 2003 – Filipienka, U. S. Viasieĺnaja abradnasć staravieraŭ-biespapoйсаŭ Bielarusi (pa etnahrafičnych materyjalach apošniaj čverci XIX stahoddzia) [Wedding ceremony of the Old Believers of Belarus (based on ethnographic materials of the last quarter of the XIX century)] / U. S. Filipienka // Staroobriadchestvo kak istoriko-kul'turnyi fenomen [Old Believers as a historical and cultural phenomenon]: materialy mezhdunar. nauch.-prakt. konf. – Gomel} : GGU, 2003. – P. 283–288. [in Belarusian]

Freizer 2003 – Freizer, A. Cyhany [Gypsies] / A. Freizer. – Minsk : Tekhnalogiia, 2003. – 272 p. [in Belarusian]

*У рэдакцыю паступіў 14.10.2021*

## Информация об авторе:

**Владимир Евгеньевич Овсейчик** – кандидат исторических наук, доцент. Полоцкий государственный университет (ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Витебская область, 211440, Республика Беларусь). E-mail: u.auseichyk@psu.by

## Information about the author:

**Uladzimir Ya. Auseichyk** – PhD in history, Associate Professor. Polotsk State University (29 Blokhin Street, Novopolotsk, Vitebsk region, 211440, Republic of Belarus). E-mail: u.auseichyk@psu.by

*Для спасылак*: Аўсейчык, У. Вобраз старавераў у фальклорнай традыцыі беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI ст.) / У. Аўсейчык // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. пр. – Мінск : Беларус. навука, 2022. – Вып. 9. – С. 79–104.

*To cite*: Auseichyk, Uladzimir. The image of old believers in the folklore tradition of the Belarusians in the Dvina region (according to the materials of the XIX − the beginning of the XXI century), Bielaruski falklor: materyjaly i dasliedavanni, 2022, iss. 9, pp. 79–104.